Весці БДПУ. Серыя 2. 2025. № 2 С. 135–138

*УДК 398.332.416:316.7*

# СЕМАНТЫЧНЫЯ І КАМУНІКАТЫЎНЫЯ АСПЕКТЫ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ КАЛЯДНАГА АБРАДУ НА ЗАХОДНІМ ПАЛЕССІ: ПАДЫХОДЫ ДА ДАСЛЕДАВАННЯ

**І. В. Хамутова,**
*аспірант кафедры культуралогіі БДУКМ*
*ORCID: https://orcid.org/000-0001-7647-44119*

Паступіў у рэдакцыю 28.01.2025.

*UDC 398.332.416:316.7*

# SEMANTIC AND COMMUNICATIVE ASPECTS OF FUNCTIONING OF CAROLING RITUALISM IN THE WEST POLESIE: APPROACHES TO THE STUDY

**I. Khomoutova,**
*postgraduate student at the Department of Cultural Studies, BSUKA*
*ORCID: https://orcid.org/000-0001-7647-44119*

Received on 28.01.2025.

Пераважна ў беларускай навуцы абрады з'яўляюцца аб'ектам вывучэння этнаграфіі і фалькларыстыцы, у той час як існуюць падыходы да абраду і рытуалу ў культуры ў цэлым, што даследуюць культурная антрапалогія і культуралогія. У культуралагічным даследаванні абрад паўстае як культурны тэкст, які складаецца з структураванай сістэмы абрадавых кодаў, што дае магчымасць вызначыць яго семантычны і камунікатыўны аспект функцыянавання у пэўнай лакальнай мікразоне. Кожны абрадавы код мае сваё семантычнае значэнне і абрадавую функцыю. Каб даследаваць абрад у вышэйузгаданым аспекце, неабходна звярнуцца да семіятычнага падыходу і, у прыватнасці, этнасеміятычнага. Вывучэнне камунікатыўнага аспекту калядавання будуецца на метадалагічным падмурку сусветна вядомых тэорый як, напрыклад, тэорыя камунікатыўнага дзеяння, якую распрацаваў Ю. Хабермас.

*Ключавыя словы:* традыцыйны абрад, культурная антрапалогія, тэарэтыка-метадалагічныя падыходы, калядная абраднасць, семантычны аспект, камунікатыўны аспект.

Mainly in Belarusian science, rituals are the subject of the study of ethnography and folkloristics, while there are approaches to ritual and ritual in the culture as a whole that explore cultural anthropology and cultural studies. In cultural research, the ritual appears as a cultural text that consists of a structured system of ritual codes that gives the opportunity to determine its semantic and communicative aspect of functioning in certain local microzone. Each ritual code has its own semantic meaning and ritual function. In order to study the ritual in the above-mentioned aspect, it is necessary to address the semantic approach and, in particular, ethnosemantic. The study of the communicative aspect of caroling is based on the methodological foundation of world-famous theories, such as the theory of communicative action, which developed by Yu. Habermas.

*Keywords:* traditional ritual, cultural anthropology, theoretical and methodological approaches, caroling ritualism, semantic aspect, communicative aspect.

*Уводзіны.* Дадзены артыкул грунтуецца на комплексным культуралагічным падыходзе да вывучэння каляднай абраднасці, які будуецца менавіта на разуменні абраду як культуралагічнай праблемы. Гэта дазваляе зрабіць семантычны аналіз элементаў абраду, а таксама праанализаваць камунікатыўны аспект заходнепалескага калядавання, што, у сваю чаргу, не закранался ў фалькларыстычных, этнаграфічных, этнамузычных працах даследчыкаў традыцыйных абрадаў. Мэта артыкула – абгрунтаваць метадалогію даследавання абраду калядавання рэгіёна Заходняга Палесся як культуралагічнай праблемы, што дазволіць раскрыць семантычныя і камунікатыўныя аспекты яго сучаснага функцыянавання.

Для больш дасканалага паглыблення ў дадзеную тэму неабходна звярнуць увагу на этымалогію паняцця «абрад». Абрады – неад'емная асноватворная частка народнай культуры. Вывучэннем абраду займаліся сусветнавядомыя культурныя антраполагі Э. Б. Тайлар, Дж. Дж. Фрэзер, Л. Г. Морган і інш. У дадзеным даследаванні за падмурак разумення функцый абраду ўзята тэорыя Э. Б. Тайлара, паводле якой усе абрады маюць часткай выяўленча-знамянальнае, або сімвалічнае, значэнне, з'яўляючыся драматычным выразам рэлігійнай думкі ці пантамімнай мовай рэлігіі; часткай жа ўяўляюць сродак зносін з духоўнымі істотамі або ўздзеяння на іх [1, с. 483]. Адпаведна, калядны абрад у дадзеным даследаванні паўстае як шырокае паняцце, якое аб'ядноўвае ўсе складаючыя часткі, абрадавыя коды і элементы святкаванняў ад вечара напярэдадні Раства Хрыстова і да Вадохрышча.

Калядныя абрады і рытуалы відавочна звязаныя з сакральным абнаўленнем. М. Эліадэ адзначыў: «Абнаўленне ў асноўным ажыццяўляецца якраз у Новы год, з надыходам новага сезоннага цыкла. Але абнаўленне, якое рытуальна ажыццяўляецца ў гэты час, з'яўляецца па сутнасці паўторам стварэння свету. Яно паўтараецца кожны Новы год. І менавіта касмаганічныя міфы нагадваюць людзям, як быў створаны свет і што адбылося пасля» [2, с. 24].

Вывучэннем каляднага абраду займаюцца сучасныя даследчыкі традыцыйнай абраднасці беларусаў – этнолагі, фалькларысты, сярод якіх варта выдзяліць доктара філалагічных навук, В. М. Шарую і яе артыкул «Рождественско-новогодняя празднично-обрядовая традиция белорусов в научных работах XIX–XX вв.» [3, с. 577–581], серыю навуковых артыкулаў Ю. М. Кучвальскай, прысвечаных вывучэнню заходнепалескай каляднай абраднасці, дзе яна закранае пытанні тэрміналогіі заходнепалескага каляднага цыклу [4], семантыкі абрадавых дзей [5], а таксама разглядае ўласцівыя мясцовай традыцыі абрадавыя добразычлівыя пажаданні [6].

*Асноўная частка.* Комплексны культуралагічны падыход дазваляе аналізаваць абрад у якасці культурнага феномена. Спецыфіка дадзенага падыходу складаецца ў наступным: традыцыйная абрадавая культура разглядаецца з пункту гледжання рэгулятыўна-камунікатыўных і каштоўнасна-нарматыўных механізмаў сацыяльнай арганізацыі, што праяўляецца ў семіясферы.

Для культуралагічнага разгляду традыцыйнага каляднага абраду выкарыстоўваецца комплекс тэарэтычных падыходаў, прынцыпаў і навуковых метадаў, бо ў сучасных даследаваннях амаль ніколі не сустракаецца выкарыстанне аднаго падыходу ў чыстым выглядзе. Праз выкарыстанне некалькіх падыходаў з'яўляецца магчымасць разгледзець аб'ект даследавання больш поўна, усебакова.

Як вядома, культурныя з'явы ўяўляюць сабой цэлыя сістэмы семантычных кодаў. У дадзеным артыкуле традыцыйны абрад калядавання разглядаецца як культурны тэкст, які патлумачаны праз сістэму кодаў. Каб даследаваць абрад у вышэйузгаданным аспекце, неабходна звярнуцца да семіятычнага падыходу [7, с. 167].

Адным з заснавальнікаў семіётыкі культуры з'яўляецца Ю. М. Лотман. Ён, акрамя семіятычнага разумення культурных з'яў, выдзяляе, па аналогіі з біясферай, семіясферу [8]. Гэта дазваляе разглядаць традыцыйную культуру як сфарміраваную на працягу стагоддзяў семіятычную прастору, у межах якой здзяйсняецца камунікатыўны акт паміж адрасатам і адрасантам абраду/рытуалу. Зыходзячы з гэтага, Каляды разглядаюцца намі як час, калі прафанная прастора жыццядзейнасці праз абрадавыя дзеянні напаўняецца іншым сімвалічным зместам, робіцца семантычна напоўненай.

Важнае тэарэтычнае і метадалагічнае значэнне для раскрыцця семантыкі цыклічнасці ў каляднай абраднасці маюць палажэнні працы «Абрады пераходу» [9] французскага этнографа і фалькларыста А. ван Генэпа, у якой на этнаграфічных матэрыялах асветлены заканамернасці жыцця чалавечых супольнасцей на тым ці іншым гістарычным этапе. Па меркаванні вучонага, «сутнасць жыцця (пачынаючы ад жыцця індывіда і завяршаючы касмічнымі з'явамі) складаецца ў паслядоўнай змене этапаў – пераходаў з аднаго стану ў іншы; канчатак аднаго этапу і пачатак іншага ўтвараюць сістэмы аднаго парадку» [9, с. 4]. Для метадалагічнай базы даследавання вельмі значны падзел А. ван Генэпам Сусвета на «свет прафанны і свет сакральны» [9, с. 7]. З цягам часу прафаннае замяшчалася сакральным. Адным са святаў, якое яскрава выдзяляецца з прафаннага жыцця беларуса, з'яўляюцца Каляды, бо яно ў вышэйшай ступені сакралізаванае. Каляды – гэта пачатак новага жыццёвага цыклу, а калядная абраднасць – сакральны акт пераходу на новы этап жыцця, пераход да новага цыклу жыцця, якое непарыўна звязана з цыклам земляробчай працы.

Для вызначэння сэнсаў абрадавых дзей трэба звярнуцца да палажэнняў тэорыі культуры Б. К. Маліноўскага, выкладзеных у «Навуковай тэорыі культуры» [10]. Па меркаванні аўтара, у аснове культуры знаходзяцца першасныя запатрабаванні, напрыклад, у здабыванні ежы, прытулку, абароне, што можна аб'яднаць як матэрыяльныя фактары, над якімі надбудоўваюцца другасныя, але ўжо не прыродныя, а культурныя. Такім чынам, культура выступае як інструмент задавальнення першасных, базавых патрэб людзей і адначасова як сукупнасць артэфактаў, арганізаваных традыцый [11, с. 41–45]. Для даследавання важную ролю мае вызначэнне Б. К. Маліноўскім грамадства як адаптыўнай сістэмы. Гэта дае магчымасць даследаваць трансфармацыю каляднай абраднасці ў адпаведнасці з асноўнымі фактарамі ўплыву на грамадства ў межах гістарычнага перыяду. Ідэі тэорыі культуры Б. К. Маліноўскага сталі падмуркам у вызначэнні аграрна-магічнай семантыкі каляднага абраду Заходняга Палесся. З мэтай вывучэнння семантычных кодаў каляднай абраднасці выкарыстоўваецца этнасеміятычны падыход.

Этнасеміётыка – дастаткова новая навука, якая актыўна пачала развівацца ў другой палове XX ст., асабліва ў ЗША. У 70-х гг. мінулага стагоддзя Ю. С. Сцяпанаў адзначыў, што этнасеміётыка, у адрозненні ад фалькларыстыкі, вывучае фальклорныя адзінкі як часткі такіх знакавых сістэм дадзенага грамадства, сэнс і роля якіх самімі чальцамі грамадства не ўсведамляюцца [12, с. 32]. Значны ўклад у развіццё беларускай этнасеміётыкі зрабіў А. У. Рагуля, працы якога ствараюць метадалагічны падмурак для далейшага даследавання фальклорных твораў і каляднай абраднасці Заходняга Палесся. Зыходзячы з дадзенага метадалагічнага падмурку, можна вызначыць абрадавыя коды, якія вызначаюцца сродкамі этнасеміётыкі:

- акцыянальны код – складаецца з шэрагу семантычных кодаў, якія рэгламентуюць паслядоўнасць абрадавых падзей;
- тэмпаральны – як адзначалася вышэй, сакралізацыя Каляднага часу;
- лакатыўны – месца правядзення абрадавых падзей у адпаведнасці з семіятычным вопытам мясцовых жыхароў;
- персанальны – сакралізацыя персанажаў абрадавых падзей, надзяленне кожнага з іх семантыкай;
- атрыбутыўны – вызначэнне семантыкі абрадавай атрыбутыкі і прылад у абрадавых дзеях;

– музычна-вербальны, музычна-інструментальны, пластычны коды – выкананне ўзораў народнай творчасці ў адпаведнасці з супольным семантычным вопытам.

Семантыка Каляд таксама можа быць раскрыта на падставе этналінгвістычнага падыходу [13, с. 9], які дае магчымасць праз этналінгвістычны аналіз фальклорных тэкстаў каляднай абраднасці выявіць семантычныя коды, якія ў іх закладзены. Таксама дадзены падыход выкарыстоўваецца для рэканструкцыі міфалагічнай свядомасці беларусаў-палешукоў.

Лінгвакультуралагічны падыход дае магчымасць разгледзець асноўныя канцэпты каляднай абраднасці, як, напрыклад, зорка, сонца, месяц і інш., якія з'яўляюцца ўзорамі традыцыйнай беларускай нацыянальнай канцэптасферы. Пры дадзеным падыходзе моўная намінацыя аб'ектаў і прадметаў шчыльна звязваецца з асаблівасцямі іх успрымання чалавекам (носьбітам традыцыі). Лінгвакультуралагічны падыход у святле антрапацэнтрычнай парадыгмы навуковых ведаў дазваляе разглядаць значэнне слова не вычэрпальна зафіксаваным у слоўнікавай дэфініцыі паняццем, а суадносіць яго, само слова, з канцэптам. Цэнтрам канцэпта заўсёды з'яўляецца каштоўнасць, паколькі канцэпт служыць даследаванню культуры, а ў аснове культуры ляжыць менавіта каштоўнасны прынцып [14, с. 3]. Такім чынам, дадзены падыход дапамагае даследаваць слова, фальклорны тэкст і непасрэдна Каляды, выяўляючы канцэпты заходнепалескай каляднай абраднасці.

Даследаванне семантычнага і камунікатыўнага аспектаў каляднай абраднасці абапіраецца на метадалагічны падмурак, закладзены Дж. Ч. Пірсам у працы «Биология трансцендентного» [15]. Аўтар спецыялізаваўся на цэлым шэрагу дысцыплін, такіх як антрапалогія, псіхалогія, біялогія, фізіка, і, адпаведна, выкарыстоўвае міждысцыплінарны падыход, што стварае ўнікальны сінтэз рознабаковых ведаў і назіранняў. Дж. Ч. Пірс выдзяляе царкву як пасрэдніка паміж чалавекам і транцэндэнтным светам [15, с. 258–259]. Гэта дае магчымасць аналізаваць калядныя тэксты з мэтай выяўлення камунікантаў.

Як вядома, творам містэрыяльнага плана (у тым ліку і калядкам) уласціва адмысловая закадаванасць міфарытуальнага зместу, якая патрабуе правядзення спецыяльных працэдур для расшыфроўкі іх сэнсу, адной з якіх з'яўляецца выяўленне камунікатыўнай стратэгіі фальклорнага «аўтара» [16, с. 84]. Каб вызначыць камунікатыўныя аспекты функцыянавання каляднай абраднасці Заходняга Палесся, трэба было звярнуцца да герменеўтычнага падыходу, які «нацэльвае на расшыфроўку сэнса твораў, г. зн. канцэптуальнага складніку мастацкага зместу» [16, с. 76]. Увогуле, па вызначэнні нямецкага філосафа, найбуйнейшага прадстаўніка Франкфурцкай школы Ю. Э. Хабермаса, «герменеўтыка разглядае мову, так бы мовіць, у працы, гэта значыць так, як яе ўжываюць удзельнікі камунікацыі з тым, каб дасягнуць агульнага разумення якога-небудзь пытання ці агульнага погляду на рэчы» [17, с. 40]. Так, сімвалічна-знакавая канцэпцыя культуры прадугледжвае герменеўтычны падыход. М. Хайдэгер вызначае герменеўтычны падыход як падыход да вывучэння рэчаіснасці, у аснове якога ляжыць анталагічная ўзаемаабумоўленасць вытлумачэння быцця чалавекам і чалавечага самавытлумачэння. Вельмі істотнай у тэарэтычным і метадалагічным плане з'яўляецца тэорыя камунікатыўнага дзеяння (1981 г. стварэння), якую распрацаваў Ю. Хабермас. Думка, якая праходзіць праз усю творчасць Ю. Хабермаса, – тэорыя пазнання магчыма толькі ў якасці тэорыі грамадства. У дадзенай тэорыі паняцце камунікатыўнага дзеяння характарызуе ўзаемадзеянне двух «размаўляючых» і дзеяздольных суб'ектаў. Слова «размаўляючыя» ўжываецца тут не выпадкова, яно падкрэслівае асаблівую ролю мовы як галоўнага сродку зносін і ўзаемадзеяння для камунікатыўнага дзеяння. Спачатку дзеячы шукаюць «агульную мову», агульнае разуменне сітуацыі, у якой працякае дзеянне, затым яны, скаардынаваўшы свае намаганні, дасягаюць сваіх мэт. Цэнтральным паняццем тут з'яўляецца паняцце інтэрпрэтацыі, якое вызначае тую фазу ўзаемадзеяння, калі дзеячы шукаюць так званую «агульную мову», гэта значыць кожны з іх пэўным чынам інтэрпрэтуе сітуацыю, у якой працякае дзеянне. Найбольш карысная для даследавання з'яўляецца глава «Реконструктивные и понимающие науки об обществе» выдання «Моральное сознание и коммуникативное действие» [17]. Дадзеная тэорыя дазваляе разгледзець камунікатыўны аспект каляднай абраднасці і вызначыць ролю камунікацыі падчас правядзення калядавання ў сучаснасці.

Разуменне мыслення і камунікатыўных ліній у абрадзе калядавання можа быць даследавана на падставе палажэнняў фундаментальнай працы Л. Леві-Бруля «Першабытны менталітэт» (1922) [18, с. 16–115], у якой аўтар звяртае ўвагу на тое, што ўсе з'явы, якія не паддаваліся вытлумачэнню ці выпадковасці, у міфалагічнай свядомасці звязваюцца са звышнатуральнымі істотамі ці магічнымі дзеяннямі (праклёнам і т. п.). У сваю чаргу, кожная магічная дзея з'яўляецца камунікацыяй са звышнатуральнымі істотамі (звышнатуральнымі сіламі).

Дыялектычны метад дазволіў разглядаць калядную абраднасць як жывую, унутрана супярэчлівую, шматбаковую з'яву традыцыйнай культуры беларусаў. Пры дапамозе дадзенага метаду даследавання вывучаецца жывая з'ява калядавання ў XXI ст., а таксама становіцца магчымым прасачыць варыятыўнасць яе бытавання (са сваімі супярэчнасцямі).

*Заключэнне.* Такім чынам, даследаванні традыцыйнага абраду ў культуралагічным аспекце будуюцца на комплексе тэарэтычных падыходаў і метадаў, як агульнанавуковых, так і адмысловых, што дае магчымасць разгледзець калядную абраднасць як культуралагічны аб'ект даследавання, у поўнай ступені раскрыць семантычны і камунікатыўны аспект яго функцыянавання.

## Літаратура

1. *Тайлор, Э. Б.* Миф и обряд в первобытной культуре / Э. Б. Тайлор ; пер. с англ. Д. А. Коропчевского. – Смоленск : Русич, 2000. – 623 с.
2. *Элиаде, М.* Аспеты мифа / М. Элиаде ; пер. с франц. В. Большакова. – М.: «Инвест - ППП», СТ «ППП», 1996. – 240 с.
3. *Шарая, О. Н.* Рождественско-новогодняя празднично-обрядовая традиция белорусов в научных трудах XIX–XX вв. / О. Н. Шарая // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск, 2021. – Вып. 2. – С. 577–581.
4. *Кучвальская, Ю.* Лакальныя асаблівасці заходнепалескай абрадавай тэрміналогіі каляднага цыклу / Ю. Кучвальская // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : памяці антраполага З. Мажэйкі : зб. навук. пр. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 58–59.
5. *Кучвальская, Ю. М.* Калядная абраднасць у традыцыйнай культуры Заходняга Палесся: асаблівасці семантыкі / Ю. М. Кучвальская // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2016. – Вып. 21. – С. 207–212.
6. *Кучвальская, Ю. Н.* Благопожелания в обходных обрядах западнополесского колядного цикла / Ю. Н. Кучвальская // Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы : материалы X Междунар. науч. конф., Гомель, 25–26 мая 2017 г. / Гомел. гос. техн. ун-т [и др.] ; под общ. ред. В. В. Кириенко. – Гомель, 2017. – С. 259–261.
7. *Толстой, Н. И.* Язык и народная культура : очерки по слав. мифологии и этнолингвистике / Н. И. Толстой. – М. : Индрик, 1995. – 510 с.
8. *Лотман, Ю. М.* Семиосфера : Сборник / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство-СПБ, 2000. – 703 с.
9. *Геннеп, А.* ван. Обряды перехода : Сист. изучение обрядов / А. ван Геннеп ; пер. с фр. Ю. В. Ивановой, Л. В. Покровской. – М. : Вост. лит. Рос. акад наук, 1999. – 198 с.
10. *Малиновский, Б. К.* Научная теория культуры = A scientific theory of culture : пер. с англ. / Б. К. Малиновский ; вступ. ст. А. К. Байбурина. – 2-е изд., испр. – М. : Объед. гуманитар. изд-во, 2005. – 182 с.
11. *Найдорф, М. И.* Функциональный анализ Б. Малиновского в курсе теории культуры / М. И. Найдорф // Культуролог Марк Найдорф. Тексты. – URL: https://www.sites.google.com/site/marknaydorftexts/theory-articles/funkcionalnyj-analiz-br-malinovskogo-v-kurse-teorii-kultury (дата обращения: 26.08.2022).
12. *Степанов, Ю. С.* Семиотика / Ю. С. Степанов. – М. : Наука. – 167 с.
13. *Толстые, Н. И.* и С. М. О задачах этнолингвистического изучения Полесья / Н. И. и С. М. Толстые // Полесский этнолингвистический сборник : материалы и исслед. / Акад. наук СССР, Ин-т славяноведения и балканистики ; редкол.: Н. И. Толстой (отв. ред.) [и др.]. – М., 1983. – С. 3–21.
14. *Панасова, Е. П.* Концепт СОЛНЦЕ в русском языке и речи : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / Панасова Евгения Петровна; Урал. гос. ун-т. – Екатеринбург, 2007. – 22 с.
15. *Пирс, Д. Ч.* Биология трансцендентного : пер. с англ. / Д. Ч. Пирс. – М. : Гаятри, 2006. – 398 с.
16. *Ковалева, Р. М.* Горизонты коммуникации в календарно-обрядовом фольклоре: сакральное и мирское / Р. М. Ковалева // Национальные культуры в межкультурной коммуникации : сб. науч. ст. по материалам II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12–13 апр. 2017 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Э. А. Усовская (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2017. – С. 73–84.
17. *Хабермас, Ю.* Моральное сознание и коммуникативное действие / Ю. Хабермас. – СПб. : Наука, Санкт-Петербургская издательская фирма, 2001. – 377 с.
18. *Леви-Брюль, Л.* Первобытный менталитет / Л. Леви-Брюль ; пер. с фр. Е. Кальщикова. – СПб. : Европ. дом, 2002. – 399 с.

## References

1. *Tajlor, E. B.* Mif i obryad v pervobytnoj kul'ture / E. B. Tajlor ; per. s angl. D. A. Koropchevskogo. – Smolensk : Rusich, 2000. – 623 s.
2. *Eliade, M.* Aspety mifa / M. Eliade ;. per. s franc. V. Bol'shakova. – M.: «Invest - PPP», ST «PPP», 1996. – 240 s.
3. *Sharaya, O. N.* Rozhdestvensko-novogodnyaya prazdnichno-obryadovaya tradiciya belorusov v nauchnyh trudah XIX–XX vv. / O. N. Sharaya // Tradycyi i suchasny stan kul'tury i mastactvaŭ : zbornik navukovyh artykulaŭ. – Minsk, 2021. – Vyp. 2. – S. 577–581.
4. *Kuchval'skaya, Yu.* Lakal'nyya asablivasci zahodnepaleskaj abradavaj terminalogii kalyadnaga cyklu / Yu. Kuchval'skaya // Aŭtentychny fal'klor: prablemy zahavannya, vyvuchennya, usprymannya : pamyaci antrapolaga Z. Mazhejki : zb. navuk. pr. / Belarus. dzyarzh. un-t kul'tury i mastactvaŭ ; redkal.: V. R. Yazykovich (starsh.) [i insh.]. – Minsk, 2017. – S. 58–59.
5. *Kuchval'skaya, Yu. M.* Kalyadnaya abradnasc' u tradycyjnaj kul'tury Zahodnyaga Palessya: asablivasci semantyki / Yu. M. Kuchval'skaya // Pytanni mastactvaznaŭstva, etnalogii i fal'klarystyki : zb. art. / NAN Belarusi, In-t mastactvaznaŭstva, etnagrafii i fal'kloru. – Minsk, 2016. – Vyp. 21. – S. 207–212.
6. *Kuchval'skaya, Yu. N.* Blagopozhelaniya v obhodnyh obryadah zapadnopolesskogo kolyadnogo cikla / Yu. N. Kuchval'skaya // Mentalitet slavyan i integracionnye processy: istoriya, sovremennost', perspektivy : materialy X Mezhdunar. nauch. konf., Gomel', 25–26 maya 2017 g. / Gomel. gos. tekhn. un-t [i dr.] ; pod obshch. red. V. V. Kirienko. – Gomel', 2017. – S. 259–261.
7. *Tolstoj, N. I.* Yazyk i narodnaya kul'tura : ocherki po slav. mifologii i etnolingvistike / N. I. Tolstoj. – M. : Indrik, 1995. – 510 s.
8. *Lotman, Yu. M.* Semiosfera : Sbornik / Yu. M. Lotman. – SPb. : Iskusstvo-SPB, 2000. – 703 s.
9. *Gennep, A.* van. Obryady perekhoda : Sist. izuchenie obryadov / A. van Gennep ; per. s fr. Yu. V. Ivanovoj, L. V. Pokrovskoj. – M. : Vost. lit. Ros. akad nauk, 1999. – 198 s.
10. *Malinovskij, B. K.* Nauchnaya teoriya kul'tury = A scientific theory of culture : per. s angl. / B. K. Malinovskij ; vstup. st. A. K. Bajburina. – 2-e izd., ispr. – M. : Ob"ed. gumanitar. izd-vo, 2005. – 182 s.
11. *Najdorf, M. I.* Funkcional'nyj analiz B. Malinovskogo v kurse teorii kul'tury / M. I. Najdorf // Kul'turolog Mark Najdorf. Teksty. – URL: https://www.sites.google.com/site/marknaydorftexts/theory-articles/funkcionalnyj-analiz-br-malinovskogo-v-kurse-teorii-kultury (data obrashcheniya: 26.08.2022).
12. *Stepanov, Yu. S.* Semiotika / Yu. S. Stepanov. – M. : Nauka. – 167 s.
13. *Tolstye, N. I.* i S. M. O zadachah etnolingvisticheskogo izucheniya Poles'ya / N. I. i S. M. Tolstye // Polesskij etnolingvisticheskij sbornik : materialy i issled. / Akad. nauk SSSR, In-t slavyanovedeniya i balkanistiki ; redkol.: N. I. Tolstoj (otv. red.) [i dr.]. – M., 1983. – S. 3–21.
14. *Panasova, E. P.* Koncept SOLNCE v russkom yazyke i rechi : avtoref. dis. ... kand. filol. nauk : 10.02.01 / Panasova Evgeniya Petrovicha; Ural. gos. un-t. – Ekaterinburg, 2007. – 22 s.
15. *Pirs, D. Ch.* Biologiya transcendentnogo : per. s angl. / D. Ch. Pirs. – M. : Gayatri, 2006. – 398 s.
16. *Kovaleva, R. M.* Gorizonty kommunikacii v kalendarno-obryadovom fol'klore: sakral'noe i mirskoe / R. M. Kovaleva // Nacional'nye kul'tury v mezhkul'turnoj kommunikacii : sb. nauch. st. po materialam II Mezhdunar. nauch.-prakt. konf., Minsk, 12–13 apr. 2017 g. / Belorus. gos. un-t ; redkol.: E. A. Usovskaya (otv. red.) [i dr.]. – Minsk, 2017. – S. 73–84.
17. *Habermas, Yu.* Moral'noe soznanie i kommunikativnoe dejstvie / Yu. Habermas. – SPb. : Nauka, Sankt-Peterburgskaya izdatel'skaya firma, 2001. – 377 s.
18. *Levi-Bryul', L.* Pervobytnyj mentalitet / L. Levi-Bryul' ; per. s fr. E. Kal'shchikova. – SPb. : Evrop. dom, 2002. – 399 s.